# Фёдар Рыгоравіч Маркаў

Нарадзіўся ён 24 снежня 1913 года ў вёсцы Качанішкі Дзісненскага ўезда Віленскай губерніі. Скончыў Свенцянскую настаўніцкую семінарыю, працаваў настаўнікам.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Фёдар Маркаў дабравольцам пайшоў у армію, быў палітруком роты, ваяваў пад Полацкам і Віцебскам. У жніўні 1941 года па рашэнні ЦК КП(б)Б быў адазваны для работы ў тыле ворага і накіраваны ў Вілейскую вобласць для разгортвання партызанскай барацьбы. Пасля двух месяцаў падпольнай работы ў Вільнюсе, Золаве і Лынтупах Маркаў арганізаваў партызанскую групу.

У канцы лістапада 1942 года на базе асобных атрадаў імя Суворава і "Знішчальнік", якія дзейнічалі ў Мядзельскім раёне, была створана партызанская брыгада імя Варашылава. Камандзірам брыгады быў назначаны Фёдар Рыгоравіч Маркаў. Брыгада імя Варашылава была адной з самых буйных і баяздольных у вобласці і налічвала ў пачатку кастрычніка 1943 года 1196 партызан.

У лістападзе 1943 года сакратара Вілейскага падпольнага абкама партыі Івана Фролавіча Клімава выклікалі ў Маскву, і ўся работа па кіраўніцтву партызанскім рухам у вобласці поўнасцю легла на плечы начальніка ваенна-аператыўнага аддзела пры падпольным абкаме КП(б)Б Фёдара Маркава.

*Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 студзеня 1944 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў у тыле ворага і за асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху на Беларусі палкоўніку Маркаву Фёдару Рыгоравічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля "Залатая Зорка".*

У прадстаўленні палкоўніка Маркава да звання Героя Савецкага Саюза гаварылася: *"Брыгадай пад камандаваннем тав. Маркава за перыяд баявых дзеянняў з 1.1. 1943 г. па 1.1.1943 г. ў баях, засадах і пры крушэннях забіта 8835 нямецкіх салдат і афіцэраў, забіта паліцэйскіх і здраднікаў – 60. Здзейснена 35 крушэнняў воінскіх эшалонаў, узарвана 42 чыгуначныя і 140 шасэйных мастоў. Знішчана танкаў і бронемашын – 8, аўтамашын – 72, прамысловых прадпрыемстваў, якія працавалі на немцаў, – 24. Разгромлена 16 нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў і 28 мясцовых управ. Знішчаны 3 чыгуначныя станцыі, 177 км тэлефонна/тэлеграфнай сувязі. Выконваючы загад аб "рэйкавай вайне", тав. Маркаў арганізаваў падрыў 4566 рэек. Маркаў Ф.Р. асабіста ўдзельнічаў і кіраваў многімі баявымі аперацыямі, дзе паказаў сябе смелым і рашучым".*

З 1944 года Фёдар Рыгоравіч працаваў намеснікам старшыні Вілейскага і Маладзечанскага аблвыканкамаў. У 1948 годзе ён скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б)Б. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і шматлікімі медалямі, у тым ліку і медалём "Партызану Вялікай Айчыннай вайны" I ступені.

Памёр Фёдар Рыгоравіч Маркаў у 1958 годзе. Пахаваны ў Маладзечне.

Імем Маркава названы вуліца і парк у Маладзечне, дзе ўстаноўлены яго бюст, вуліцы ў гарадах Вілейка і Паставы, у гарадскіх пасёлках Лынтупы і Мядзель. У Вілейскім краязнаўчым музеі і Мядзельскім музеі народнай славы Фёдару Рыгоравічу прысвечаны стэнды.